мастацкі знак, шырыню разумовай актыўнасці, неспецыфічную цікавасць абумоўлены псіхафізіялагічнымі здольнасцямі індывіда. Так, больш высокая агульнамазгавая актывізаванасць выяўлена ў асоб, якія схільныя да мастацкіх відаў дзейнасці, патрабуючых эмацыянальнай спагадлівасці, імпульсіўнасці, сілы рэагавання. Пры схільнасці да тэхнікі, работа з якой патрабуе цярплівасці, абачлівасці, уседлівасці, выяўлены нізкі ўзровень агульнамазгавой актывізаванасці. Правапаўшарная база псіхафізіялагічных функцый вызначае прыцягненне да заняткаў у сістэме «чалавек — чалавек», абумоўлівае такія якасці, як таварыскасць, эмацыянальнасць, дынамізм і шырыню камунікатыўных сувязей асобы.

Супастаўленне ўласцівасцей нервовай сістэмы па сіле з ўзроўнем разумовага развіцця паказала адсутнасць сувязі у гэтым накірунку, але хуткасць вырашэння рэпрадуктыўных арыфметычных задач у значнай меры залежыць ад уласцівасці рухавасці (Малкаў Н.А.). Псіхафізіялагічныя даследаванні паказваюць сувязь прадукцыйнасці міжвольнага рознага матэрыялу з электрафізіялагічным паказчыкам лабільнасці нервовай сістэмы, а адвольнага вялікага аб'ему — з сілай нервовай сістэмы (Голубева Э.А., Трубнікава Р.С.). Пры гэтым хуткасць і глыбіня завучвання залежаць ад супрацьлеглых уласцівасцей нервовай сістэмы — рухавасці, інертнасці. Механічнае запамінанне вялікага аб'ему і працягласць яго захавання часцей сустракаюцца ў асоб з моцнай нервовай сістэмай; слабыя лепш захоўваюць асэнсаваны, лагічна структураваны матэрыял.

У тыповай сітуацыі вучэбнай дзейнасці пры нервова-псіхічным напружанні, якое выклікаецца дрэннай адзнакай, кантрольнымі работамі, іспытамі, індывідуальныя адрозненні ў ступені псіхічнага напружання залежаць таксама ад уласцівасцей нервовай сістэмы: у падлеткаў са слабай нервовай сістэмай памылкі ў сувязі з недастатковым размеркаваннем увагі ў кантрольных работах сустракаюцца значна часцей, чым ў звычайнай вучэбнай рабоце. Кантрольная работа ў вучняў са слабай нервовай сістэмай адмоўна дзейнічае і на якасць выканання вучэбных дзеянняў і аперацый.

Разуменне псіхафізіялагічных механізмаў розных бакоў здольнасцей асобы дазволіць адэкватна ажыццявіць дыферынцыраваную дыягностыку, больш эфектыўна вырашаць задачы прафесійнага навучання асобы ў розных відах дзейнасці.

**Глубачэнка В.М.,**
канд.пед.навук

## МУЗЫЧНА-ТВОРЧЫЯ ЗДОЛЬНАСЦІ АСОБЫ І ІХ РАЗВІЦЦЁ Ў ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ

Любое цывілізаванае грамадства, якое клапоціцца аб сваёй будучыні і імкнецца да прагрэсіўнага развіцця, зацікаўлена ў фарміраванні людзей ініцыятыўных, нестандартна мыслячых, здольных да пераўтваральнай дзейнасці на карысць гэтага грамадства. Невыпадкова ў галіне музычнай адукацыі развіццё музычна-творчых здольнасцей навучэнцаў на розных ступенях вучэбна-выхаўчага працэсу — адна з прыярытэтных задач.

Пад музычна-творчымі здольнасцямі мы разумеем якасці асобы, якія дазваляюць паспяхова, на творчым узроўні займацца музычнай дзейнасцю. Як вядома, творчасць патрабуе ўключэння шырокага кола фізічных, разумовых, душэўных сіл суб'екта ў працэс дзейнасці. Таму асноўнай праблемай, з якой сутыкаюцца даследчыкі тэорыі творчасці, з'яўляецца сістэматызацыя творчых здольнасцей. Адны пры гэтым абапіраюцца на ўмоўна вылучаныя фазы творчага працэсу (ад музычных адчуванняў да музычнага інтэлекту), другія — на тыя ці іншыя спосабы дзеяння (тэхнічныя, слыхавыя), трэція зыходзяць з наяўнасці канкрэтных відаў музычнай дзейнасці (слуханне, выкананне, стварэнне музыкі) і інш.

Перш чым весці гаворку аб музычна-творчых здольнасцях, мы лічым неабходным



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

удакладніць разуменне намі музычнай творчасці. На сённяшні дзень у навукоўцаў і музыкантаў існуюць даволі розныя меркаванні на гэты конт. Некаторыя пад музычнай творчасцю разумеюць толькі складанне музыкі, супрацьпастаўляючы яго выкананню і слуханню. Іншыя адносяць да музычнай творчасці ўсякую музычную дзейнасць незалежна ад яе вынікаў. Напрыклад, сам факт удзелу ў самадзейным калектыве разглядаецца як музычная творчасць. Адны творцамі лічаць выключна геніяльных музыкантаў, другія творчасць бачаць у самых нязначных зменах у выніках музычнага вопыту.

Найбольш распаўсюджаным у навуковай літаратуры з'яўляецца погляд на творчасць як на вышэйшую форму чалавечай дзейнасці. Творчай дзейнасці ўласцівы такія прыметы, як навізна, арыгінальнасць, значнасць, яе ўвязваюць з функцыяй развіцця, пераўтварэння. Прынцыпова важным з'яўляецца прызнанне магчымасці творчых праяўленняў у любой дзейнасці. Адсюль вынікае, што любая музычная дзейнасць (слуханне, выкананне, стварэнне музыкі і інш.) пры пэўных умовах можа лічыцца творчай.

Абавязковай умовай і важнейшай прыметай творчай дзейнасці з'яўляецца прысутнасць рэпрадуктыўнага і прадуктыўнага кампанентаў у яе структуры. Наяўнасць рэпрадуктыўнага кампанента забяспечвае выкананне такіх функцый, як аднаўленне, захаванне, паўтор музычнага матэрыялу, а прадуктыўнага — стварэнне новага, пераўтварэнне, змяненне. Прычым менавіта прадуктыўнаму пачатку адводзіцца вядучая роля ў творчым працэсе.

У адпаведнасці з дзейнасцю музычна-творчыя здольнасці таксама могуць быць умоўна падзелены на рэпрадуктыўныя і прадуктыўныя. Да рэпрадуктыўных здольнасцей асобы адносяцца такія, якія накіраваны на ўспрыманне, уяўленне, запамінанне, узнаўленне мастацкіх вобразаў ці элементаў музычнага тэксту. Сярод прадуктыўных здольнасцей важнейшымі выступаюць прадуктыўнае ўяўленне, прадуктыўнае (або дывергентнае) мысленне, інтуіцыя.

Падобна творчасці, якую мы абазначылі як адзінства рэпрадуктыўнага і прадуктыўнага, аб музычна-творчых здольнасцях мы таксама можам гаварыць як аб цесным ўзаемадзеянні рэпрадуктыўных і прадуктыўных здольнасцей. Менавіта адзінства гэтых здольнасцей у іх узаемаабумоўленых прапарцыянальных суадносінах і дазваляе дзейнасці змяшчаць у сабе элементы вопыту, мець пэўную пераемнасць і адначасова быць накіраванай на стварэнне, у адным выпадку, суб'ектыўных, у другім, агульнакультурных каштоўнасцей. А ў канчатковым выніку наяўнасць пералічанага дае падставу назваць дзейнасць творчай.

Як вядома, здольнасці праяўляюцца, а таксама фарміруюцца ні ў чым іншым, як у дзейнасці. Раз мы вызначылі, што творчасць магчыма ў любым відзе музычнай дзейнасці, адпаведна развіццё творчага патэнцыялу асобы можа адбывацца ў працэсе самых розных музычных заняткаў. Аднак было б памылковым лічыць, што ўсякая дзейнасць аднолькава насычана творчымі элементамі і ў роўнай меры прыгодна для развіцця творчых здольнасцей.

Умоўная дыферэнцыцыя сукупнай музычнай дзейнасці на рэпрадуктыўную і прадуктыўную формы (да першай адносіцца слуханне і выкананне музыкі, да другой — сачыненне і імправізацыя) дазваляе больш ці менш пэўна вызначыць, якая група здольнасцей можа найбольш эфектыўна развівацца ў працэсе тых ці іншых заняткаў. Так, слуханне і выкананне музыкі садзейнічаюць развіццю здольнасцей успрымання, асацыятыўнага ўяўлення, абагачаюць памяць суб'екта. У працэсе музычнага сачынення і імправізацыі актыўна фарміруюцца прадуктыўныя здольнасці. Як бачым, музычна-творчае развіццё асобы найбольш поўна можа адбывацца ў тым выпадку, калі ў вучэбным працэсе арганічна спалучаюцца абодва віды дзейнасці — рэпрадуктыўны і прадуктыўны.

Найбольш праблематычным і найменш распрацаваным у сучаснай музычнай псіхалогіі і педагогіцы з'яўляецца феномен музычна-прадуктыўнай дзейнасці. Спынімся на яе развіццёвых магчымасцях, на тых здольнас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цях і якасцях, якімі неабходна валодаць кампазітару і імправізатару. Сярод іх можна акрэсліць такія, як самастойнасць суб'екта дзейнасці, арыгінальнасць, уражлівасць, персанальная адказнасць за створаны прадукт, выбіральнасць, мужнасць мець уласную думку, гатоўнасць ісці на рызыку. Гэта таксама прадуктыўнае мысленне, асноўная функцыя якога зводзіцца да стварэння новага музычнага зместу, што выказваецца пры дапамозе новай гукавой канструкцыі. Дывергентнае мысленне накіравана на пошук лагічных магчымасцей і заўсёды стаіць перад альтэрнатывай выбару ці шляху мастацка-вобразнага развіцця, ці музычна-выразных сродкаў увасаблення. Гэта і прадуктыўнае ўяўленне, якое ў адрозненне ад рэпрадуктыўнага, накіравана на стварэнне вобразаў на аснове самых розных камбінацый элементаў былога вопыту. Не менш важнай здольнасцю, неабходнай як кампазітару, так і імправізатару, з'яўляецца інтуіцыя. Далучэнне да дзейнаснага працэсу неўсвядомленай сферы — абавязковая ўмова ўсялякага творчага акта. Інтуіцыя, як правіла, цесна ўзаемадзейнічае з лагічным мысленнем. І там, дзе для вырашэння праблемы суб'екту творчасці аказваецца недастаткова ведаў, вопыту, на дапамогу прыходзіць інтуіцыя.

Развіццё музычна-прадуктыўных здольнасцей навучэнцаў у сучасных умовах -- адна з найбольш важных задач, якія стаяць перад сістэмай музычнай адукацыі. Школа, як і раней, арыентуецца на авалоданне рэпрадуктыўнай дзейнасцю, на засваенне гатовых ведаў. Творчае развіццё асобы галоўным чынам ажыццяўляецца ў рамках выканання. Гэта прыводзіць да аднабаковага, гіпертрафіраванага развіцця рэпрадуктыўных здольнасцей на шкоду прадуктыўным. Прынцып адзінства рэпрадуктыўнай і прадуктыўнай музычнай дзейнасці павінен стаць асноўным прынцыпам музычнага выхавання. Для гэтага неабходна ўключэнне ў вучэбны працэс блока дысцыплін, вузка накіраваных на авалоданне навыкамі імправізацыі, сачынення і апрацоўкі музыкі. Выкладаць названыя дысцыпліны, вядома ж, трэба выкладчыкам, якія маюць вопыт практычнай дзейнасці ў адпаведнай галіне і валодаюць методыкай навучання. Істотным фактарам, які перашкаджае эфектыўна займацца музычна-прадуктыўнай дзейнасцю і паспяхова развіваць музычна-творчыя здольнасці навучэнцаў, з'яўляецца недастатковая навукова-метадычная забяспечанасць вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Пераадоленне акрэсленых супярэчнасцей дазволіла б павысіць эфектыўнасць музычнай падрыхтоўкі спецыялістаў, прывесці яе ў адпаведнасць з навукова абгрунтаванымі патрабаваннямі, непазбежна спрыяла б усебаковаму і гарманічнаму развіццю асобы навучэнца, фарміраванню яго музычна-творчых здольнасцей.

**Зыгмантовіч С.В.,**
*дацэнт*
**Клімянкова Н.У.,**
*дацэнт*

## ФАРМІРАВАННЕ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КУЛЬТУРЫ СТУДЭНТАЎ — АКТУАЛЬНАЯ ЗАДАЧА ПАДРЫХТОЎКІ БУДУЧЫХ БІБЛІЯТЭКАРАЎ-БІБЛІЁГРАФАЎ

Фарміраванне камунікатыўнай культуры бібліятэкара-бібліёграфа, яго гатоўнасці да эфектыўных прафесійных зносін — найважнейшы аспект падрыхтоўкі будучага спецыяліста. Ён не толькі павінен валодаць інфармацыяй, быць прафесіяналам у галіне сучасных бібліятэчна-інфармацыйных тэхналогій, але і на высокім узроўні ажыццяўляць функцыі пасрэдніка паміж творамі друку, іншымі носьбітамі інфармацыі і карыстальнікам, чытачом. А гэта немагчыма без высокай камунікатыўнай кампетэнтнасці, якая ў рэшце рэшт вызначае здольнасць альбо няздольнасць чалавека да зносін. Уменні і навыкі, што ўваходзяць у склад камунікатыўнай кампетэнтнасці, можна ўмоўна падзяліць на тры групы: перцэптыўныя, камунікатыўныя і інтэрактыўныя. Такая градацыя адпавядае псіхалагічнай структуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ